View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

# Праўда жыцця і праўда калектывізацыі: да праблемы чалавеказнаўчых аспектаў рамана М. Зарэцкага "Вязьмо"

Беларуская літаратура надзвычай адчувальная да духоўных аспектаў у сацыяльна-палітычных праблемах жыцця; не была выключэннем і творчасць Міхася Зарэцкага. Неардынарны склад мыслення пісьменніка выявіў свае крэатыўныя магчымасці ў разнастайных тэмах: калектывізацыі, тэме «былых», «учарашніх», узаемаадносін полаў. Ён пісаў і пра рэвалюцыю («Сцежкі-дарожкі»), і пра новую вёску («Падарожжа на новую зямлю»), і пра трагічныя лёсы прадстаўнікоў былога класа эксплуататараў («Адна партыя ў шашкі», «Кветка пажоўклая», «Двое Жвіроўскіх», «Ворагі»), і пра праблемы адраджэння нацыянальных каранёў («Крывічы»).

Не мог застацца М. Зарэцкі ў баку і ад чалавеказнаўчых праблем, народжаных часам калектывізацыі, але тварыць свабодна ва ўмовах, якія склаліся вакол пісьменніка ў 1930-я гг., было складана. Добра вядома, што пасля публікацыі нарыса «Падарожжа на новую зямлю» (1928) і пачатковых раздзелаў рамана «Крывічы» (1929) вульгарызатарская крытыка распачала публічную траўлю мастака – М. Зарэцкага выключылі з партыі, псіхалагічна зламалі, прымусілі апраўдвацца і каяцца ў грахах, якіх не было.

У гэты час на Беларусі пачалася калектывізацыя, і М. Зарэцкі павінен быў засведчыць сваю падтрымку новаму працэсу. Але, з аднаго боку, Зарэцкі-мастак не мог прыняць тагачасныя формы «рассяляньвання сялянства» (Мушынскі 1991, 226), здрадзіць сваім гуманістычным прынцыпам абароны чалавечай годнасці безадносна да класавай прыналежнасці. А з другога боку, трэба было ўлагодзіць ваяўнічую крытыку, адвесці ад сябе палітычныя абвінавачанні праваднiка ідэалогіі нацыянал-дэмакратызму.

У такіх складаных умовах М. Зарэцкі піша раман «Вязьмо» (1932), у якім І. Мележ убачыў «суровы рэалізм і мужную глыбіню» і назваў яго «самым глыбокім творам тых часоў пра калектывізацыю» (Мележ 1969). Якім жа чынам дасягаецца гэтая глыбіня? Даследчыкі творчасці беларускага пісьменніка (А. Адамовіч, С. Гусак, В. Каваленка, А. Майсеенка, М. Мушынскі і інш.) пісалі пра адметнасць яго манеры мыслення, светабачання, асаблівасці рамантычнай мовы, адзначалі, што мастаку не былі ўласцівы зададзенасць, схематызм, дыдактыка і пісьменнік свядома аддаваў перавагу шматсэнсавасці, поліфаніі ў «плыні жыцця». Літаратуразнаўцы І. Чыгрын («Проза «Маладняка»), М. Мушынскі («Нескароны талент») надавалі ўвагу праблеме рамантызму ў творчасці пісьменніка, выказвалі ідэю сінтэзу рэалістычнай і рамантычнай традыцый.

Сапраўды, М. Зарэцкі плённа выкарыстоўваў магчымасці рамантычнай паэтыкі і па-мастацку ўвасабляў ідэю бясконцай шматлікасці і вечнага станаўлення свету. Ю. Лотман мастацкую сістэму рамантызму адносіў да сістэм, у аснове якіх ляжыць «эстэтыка супрацьпастаўлення», а не «эстэтыка тоеснасці» (Лотман 1999, 234). Кантраст у паэтыцы «Вязьма» выконвае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

функцыю спасціжэння складанасці і шматмернасці жыцця, ён дазваляе павярнуць з'яву рознымі бакамі, разглядаць яе на розных стадыях. Кантрасна-паралельныя супастаўленні і супрацьпастаўленні, матыў парнасці, двайнікоў (Карызна – Пацяроб, Вера Засуліч – Марына Паўлаўна, Віктар – Зелянюк і г. д.) утвараюць унутраны драматызм твора і нагадваюць пра адзінства супрацьлегласцей, калі адна рэч знаходзіць сябе ў іншай, калі межы размыты і адначасова ўзаемадзейнічаюць прыцяжэнне і адштурхоўванне.

Дваістасць натуры Сымона Карызны праяўляецца ва ўсім: ва ўзаемаадносінах з жонкай і Верай Засуліч, адначасовым шкадаванні і злосці на гаспадара коніка, якога павінны аддаць у калгас, і на бацькоў, апынуўшыхся па падказцы сына ў дваякім становішчы. Карызна сур’ёзна заклапочаны: як сумяшчаць прынцыповасць на рабоце з асабістымі праблемамі бацькоў, з унутраным душэўным дыскамфортам? «Бязлітасна мардавалі яго крутыя пераходы ад ціхага заспакаення да раптоўнага страху і роспачы. То яму здавалася, што ўсё гэта – глупства, што ўсе турботы яго дарэмныя. <...> А то раптам сляпучай маланкай бліскала перад ім агнявая здань небяспекі...» (Зарэцкі 1991 III, 80).

Кантраснае супрацьпастаўленне ўвесь час праяўляецца і ў каханні герояў: яно нясе не толькі радасць яднання, але і немагчымасць сумеснага жыцця (Вера Засуліч – Сымон Карызна, Аўгінька – Віктар, дачка Карызны Стася – Зелянюк). Слодыч кахання адначасова тоіць у сабе і боль, і пакуты, і выпрабаванні, што выяўляе складанасць асобы і чалавечых узаемаадносін. Педантычны аптэкар Плакс, празваны местачковым флегматыкам-філосафам («сівецкі філосаф-мізантроп»), канстатуе: «У кожнага пытання ёсць дзве нагі: правая і левая. <...> У кожнае лахманіны ёсць два бакі: верх і спод» (Зарэцкі 1991 III, 14). Плакс павучальна тлумачыць: «Кожнай галаве ўласцівы два працэсы: думаць і балець, і гэтыя працэсы ўзаемна абумоўлены: хто больш думае, у таго і больш баліць галава» (Зарэцкі 1991 III, 43). За іранічным адценнем у яго словах схаваны трагізм сітуацыі.

Кантраст у поглядах на калектывізацыю Карызны і Пацяроба як спосаб неадназначнага стаўлення да грамадскай з’явы сведчыць аб імкненні пісьменніка спасцігаць жыццё ў супярэчлівым адзінстве, у пастаяннай дынаміцы і незавершанасці. Апора М. Зарэцкага на рамантычную эстэтыку стварыла ў «Вязьме» адкрытую сэнсавую перспектыву, пазначыла рух ад канкрэтнага да абстрактнага. Калектывізацыя, напрыклад, вызваляла з-пад кантролю тыя аспекты зла, якія ператвараліся ў метафізічнае зло, агаляла такія схаваныя чорныя глыбіні ў чалавеку, якія пры іх узаемадзеянні правакавалі хаос і катастрофы. Тэма злачынства ўзнікае ў рамане ў шматлікіх варыянтах: у сям’і, у адносінах паміж закаханымі, у стаўленні кіраўнікоў да аднавяскоўцаў-сялян, да чалавека наогул. Не быў тут выключэннем і Сымон Карызна («Трэба быць жорсткім. І перш-наперш – да самога сябе» (Зарэцкі 1991 III, 73). Найглыбейшую пераробку чалавека, лічыў герой, можна ажыццявіць толькі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

«рашучым рэвалюцыйным ударам» (Зарэцкі 1991 III, 73). «Універсальную злосць» перарабіць «у здаровую дзейную сілу» (Зарэцкі 1991 III, 153) намераны рабочы Зелянюк.

Праблему злачынства ў рамане М. Зарэцкі найперш звязвае з вобразам Пацяроба. Схаваны імпульс зла дрэмле ў натуры героя да таго часу, калі канчаткова страчаны ўсе маральна-этычныя перашкоды для гэтага, магчымасць яго рэалізацыі ўвесь час нагадвае пра сябе: «Пацяроб быў наскрозь чалавек адміністрацыйны і не любіў малімоніцца. Першая ягоная акцыя, чым ён адгукнуўся на шырокі рух рэканструкцыі, была тая, што ён на раменьчыку цераз левае плячо начапіў на сябе наган. Хадзіў ён скрозь з адчайна зморшчанаю аж да плаксівасці мінаю, якая азначала разам і пагарду да людзей, што яго абкружалі, і горкую муку за іхнюю безнадзейную нягегласць. <...> Пацяроб адчуваў сябе ніякава: яму не давалі разысціся. <...> І Пацяроб чакаў да пары, пацяшаючы сябе ўспамінамі аб калішніх сваіх баявых аперацыях ды пераносячы яскравыя карціны іх у блізкую будучыню» (Зарэцкі 1991 III, 66–67). Як бачым, чалавеказнаўчыя аспекты калектывізацыі ў асэнсаванні пісьменніка-гуманіста сталі надзвычай сугучнымі фундаментальным філасофскім катэгорыям.

У кантрасным супрацьпастаўленні вобразаў (Карызна – Пацяроб, Віктар – Зелянюк, Сівец – Сівалапы, Марына Паўлаўна – Вера Засуліч, Якуб Лакота – Андрэй Шыбянкоў, Галілей – Плакс) можна бачыць своеасаблівы прыём «іранічнага расчаплення жыцця» (Паўлава 2000, 190), функцыя якога не ў сатырычным паказе рэчаіснасці, а ў стварэнні іроніі канструктыўнай, задача якой у тым, каб пазбегнуць адназначных вывадаў. Менавіта такая роля ўскладзена на апазіцыю Галілей – Плакс. Супярэчлівае адзінства гэтых герояў выяўляе вялікую колькасць супрацьлеглых ідэй і поглядаў. Такі аўтарскі падыход дае магчымасць паглядзець на з'яву з розных бакоў, не прэтэндуючы пры гэтым на ісціну ў апошняй інстанцыі.

Нетрадыцыйна змястоўным для таго часу аказаўся вобраз дзівака Галілея, які, з аднаго боку, напоўнены аўтарскай іроніяй, а з другога, – канцэптуальна ёмісты, па-філасофску глыбінны. Невыпадкова даследчык М. Мушынскі назваў яго «бясспрэчнай творчай удачай М. Зарэцкага» (Мушынскі 1991, 255). Дзядзька Ахрэм (па-местачковаму празваны Галілеем) здольны бачыць двухсэнсоўнасць жыцця, у кожнай з’яве ён прыкмячае два планы – той, што бачны, і другі, схаваны, нябачны. Які з іх больш важны – адназначна вызначыць цяжка, гэтыя планы ўзаемаперацякальныя. Іронія Галілея, «старога мудрагеля», «хітруна», «наравістага шукальніка», як называе яго М. Зарэцкі, здольна расшчапляць рэчаіснасць, агаляць яе схаваныя цёмныя бакі. Кожная падзея для героя – гэта толькі адзінкавы выпадак з вялікай колькасці. Ён умее назіраць за людзьмі, бо праз «маленькую шчэлачку чалавечага нутра», па яго словах, можна ўбачыць, «якая гэта ёсць рэвалюцыя, супроць каго яна ідзе і ў які

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

бок мае павярнуць людское жыццё», і «... хто ж судзіць будзе, а хто ж адказ будзе браць? А хто ж прысуд накладаць?» (Зарэцкі 1991 III, 52–53).

Газет і кніжак Галілей не чытае, бо ў кніжках, як лічыць «стары мудрагель», зафіксаваны чужы вопыт. Вясковаму «шукальніку» важна самому зразумець цяперашні момант: «Ён захапляўся кожнай праблемай, якая траплялася на ягоным жыццёвым шляху, – усё роўна, ці мела яна непасрэднае да яго дачыненне, ці не – і з роўнай стараннасцю біўся над яе развязаннем. Такі ўжо быў Галілееў характар!» (Зарэцкі 1991 III, 7). Погляд Галілея на чалавека не дагматычны: «Усё ламаецца, дык і чалавек мусіць ламацца. Не ў тым, дык у тым...» (Зарэцкі 1991 III, 8). Намаганні героя скіраваны на разгадванне таямніц сучаснасці, якая разбурае спрадвечную светабудову: «Рэвалюцыя ідзе... Рэвалюцыя заўсёды шукае чые-небудзь пагібелі. З гэтай пагібелі – іншым шчасце... Я не ведаю... не разумею... Нічога не разумею» (Зарэцкі 1991 III, 40). Неардынарнасць вобраза старога падкрэслівае і выгляд яго хаты: «На самым канцы мястэчка кідаецца ў вочы смешная хацёнка Галілея. Яна стаіць адна сярод пустога прагалу – ні двара пры ёй, ні плота, нічым-чагенечка. Стаіць, самотная, нудная, засыпаная сумётамі снегу, і толькі, як дзікі недарэчны ўбор на галаве ў вар'ята, узносяцца над  страхой непамерна вялікія, грамоздныя крылы ветрака» (Зарэцкі 1991 III, 38).

Аўтарскі падыход да абмалёўкі вобраза сведчыць аб яго функцыянальнай важнасці ў структуры твора, яго канцэптуальнай філасофскай ёмістасці для вырашэння маральна-этычнай праблематыкі часу. Вядомы філосаф-багаслоў П. Фларэнскі пісаў пра XX ст.: «Научное мировоззрение и качественно и количественно утратило тот основной масштаб, которым определяются все прочие наши масштабы: самого человека» (Фларэнскі 1990 II, 348). Абсалютызацыя рацыяналістычнай канцэпцыі свету небяспечная для чалавецтва, яна прыводзіць да распаду сусвету на лагічную сістэму (прыярытэтную) і духоўную, якая аб'яўлена фікцыяй і пазбаўлена пазнавальнай функцыі. Заняпад канцэпцыі асобы адчуваў М. Зарэцкі і праз вобраз Галілея выказаў сваю нязгоду з негатыўнымі працэсамі. Духоўнасць, на думку аўтара «Вязьма», не можа быць атаясамлена толькі з разумнасцю, як і розум не павінен стаць адзінай формай ведаў: «Дзіўны чалавек гэты Галілей! Яму мала таго, што чуе ён дзень у дзень на розных сходах і мітынгах, яму мала таго, што бачыць ён сам на свае ўласныя вочы ў Сіўцы, – ён шукае яшчэ нечага агульнага і глыбокага, адзінага ў сваёй першаістотнай глыбіні. Ад людзей ён чакае не тлумачэнняў, не інструкцый. <…> І мардуецца стары ў нязбыўных турботах, блудзіць па глухім гушчары сумненняў, калоціцца ад ліхога трывожнага страху» (Зарэцкі 1991 III, 121). Жыццёвы вопыт Галілея падказваў старому, што вялікая небяспека тоіцца ў распадзе духоўна-пачуццёвай цэласнасці светаўспрыняцця.

Сам вясковы «шукальнік» з яго цягай да тэхнічных навацый не пазбаўлены і пачуццёвага. Прыгадаем аўтарскае апісанне Галілеевай манеры спяваць: «Галілей пяе, як певень. І, як у пеўня, заўсёды адзін у яго музыкальны матыў –

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

аднастайны і дзікі, мабыць, падобны да прымітыўнага спеву першабытнага чалавека» (Зарэцкі 1991 III, 157). Герой Зарэцкага напоўнены моцным інстынктыўным пачаткам, які надае яму сілы для творчых тэхнічных вынаходніцтваў. «Галілей пяе цяпер таму, што робіць важную і цікавую рэч (макет Сіўца будучыні. – *Т. Т.*), якую трымае ў найвялікшай таямніцы, пра якую не ведае ніводзін чалавек у свеце...» (Зарэцкі 1991 III, 158).

Вобраз Галілея акумулюе ў сабе погляды на калектывізацыю розных людзей. Толькі не сама калектывізацыя цікавіць старога, а тое, як яе ўспрымаюць жывыя людзі, такія непадобныя і непрадказальныя, як Плакс, Гвардыян, Зелянюк, Пацяроб, Лакота і інш. «Стары мудрагель» заклапочаны пытаннем: што перашкаджае чалавеку ажыццявіць ружовыя мары аб ідэальнай светабудове, чаму няма ў людзях аднадумства? «Чалавеку дружнасці бракуе, во яно што…» (Зарэцкі 1991 III, 130), – сцвярджае Галілей. А ў такім выпадку заўсёды будуць пакрыўджаныя. Невыпадкова ён увесь час дапытваецца: «Перш яно тое... якая гэта ёсць рэвалюцыя?.. Ці скончылася яна так ці не?.. Можа гэта другая ўжо... ага...» (Зарэцкі 1991 III, 16). Відавочна, што спрошчаны адказ не задаволіць Галілея, ён не хоча чуць «найпрасцейшых, найзразумельшых слоў» ад Зеленюка, герой шукае «менавіта слова мудронага, якое б захапіла яго не так яснасцю свайго значэння, як спрытнай тэхнічнай дасканаласцю, штукарскай прыточанасцю адмысловай формы да глыбокага зместу» (Зарэцкі 1991 III, 131). А глыбокі змест для Галілея – гэта змест усебаковы, дыялектычна супярэчлівы і зменлівы. Простае слова ў разуменні старога ёсць статыка, яно не можа выявіць сутнасць найскладанейшай з’явы, асабліва калі яна тычыцца лёсу людзей.

Вобраз Галілея не паддаецца адназначнаму тлумачэнню: то ён прыхільнік тэхнікі, то сэрцу больш давярае, чым розуму: «Сэрцам больш імеш, чымся розумам… <…> А без сэрца чалавеку няможна… ага… зусім няможна… Без сэрца розум высахне ў чалавека…» (Зарэцкі 1991 III, 242). Прамалінейны Пацяроб лічыў Галілея «нічэмным, ні да чаго не прыдатным» чалавекам. Дыялектычнае спалучэнне апазіцыйнай раздвоенасці ў вобразе старога сведчыць пра гнуткасць мыслення беларускага пісьменніка, яго здольнасць выяўляць множнасць ісцін. Так, на пытанне Марыны Паўлаўны аб цяжкасцях калектывізацыі Галілей адказвае: «Тэхнікай трэба браць… ага… тэхнікай… А яны не ўмеюць… хі-хі-хі…не ўмеюць. <…> Яны баяцца» (Зарэцкі 1991 III, 262). Зразумела, не пра жалезныя машыны вядзе гаворку Галілей з жонкай Карызны, а пра тэхніку размовы з людзьмі, пра чуласць, сардэчнасць. Успомнім просьбу Таццяны да Зеленюка, каб той растлумачыў ёй неабходнасць калектывізацыі: «Скажы неяк так, каб зразумела я... На сходзе я чула, ды нічога не ўцямлю я там, хоць і словы, здаецца, простыя... Ведама, гавораць адразу ўсім, дык па колькі там каму прыйдзецца! *А ты так скажы, каб усё мне адной...* (выдзелена мной. – *Т. Т.*)» (Зарэцкі 1991 III, 58). Словы Таццяны раскрываюць аўтарскае разуменне сутнасці чалавека, яго ўнутранай цягі да ўсведамлення сваёй адзінкавасці, унікальнасці, да поўнай свабоды

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

самавыяўлення. Перспектыва калектыўнай гаспадаркі якраз пазбаўляла чалавека такой індывідуальнай адзінкавасці. Сямідзесяцігадовы вопыт Савецкай улады, якая не ўлічвала экзістэнцыяльную сутнасць быцця чалавека, засведчыў марнасць калектывісцкіх абагульненняў.

Палеміка Галілея з Плаксам абвяргала аднамерныя, спрошчаныя ўяўленні аб чалавеку, яго памкненнях і пошуках, яна ўвасабляла магчымасць выбару індывідуальных паводзін. Сімвалічна змястоўную канцоўку мае «Вязьмо»: жыхарам прапаноўваецца паглядзець на зроблены Галілеем макет Сіўца будучыні, у якім мала што нагадвае вёску да калектывізацыі: «Роўныя, чыстыя, асветленыя электрычнасцю вуліцы, новыя вялікія дамы дзіўнай, у свеце нябачанай архітэктуры, старанна дапасаванай да найбольшае выгоды жылля. <…> ...сярод усяе гэтае раскошы, як барадаўка на чыстым здаровым целе, тырчала ў поўнай сваёй красе мізэрная, убогая Галілеева хацёнка…» (Зарэцкі 1991 III, 296–297). Сэнс макета Галілея аўтар не раскрывае, але размова старога Ахрэма з аптэкарам Плаксам пралівае святло на кірунак аўтарскай думкі. Прыгадаем гэты дыялог цалкам:

«– Гэта – тэхніка, Галілей? Га?..

Галілей, не сунімаючы свае дробнае лёгкае хады, адказаў:

– Кхе-кхе… Тэхніка, доктар… ага… тэхніка…

– А дзе ж там твой чалавек, Галілей? Я не бачыў там чалавека… Чаму ты, Галілей, якога новага чалавека сабе не прымудраваў, га?

Гэта падступнае запытанне сівецкага мізантропа, відаць, дадзела старому, і ён з навучальнай строгасцю прабурчаў:

– Няможна, доктар, так казаць пра людзей… ага… няможна… Новых людзей не трэба… Гэтыя людзі будуць новыя… Трэба, доктар, чалавека любіць… ага… трэба любіць…» (Зарэцкі 1991 III, 297–298).

Дыскусія дзядзькі Ахрэма з Плаксам – гэта роздум самога М. Зарэцкага над прыродай чалавека, яго маральнымі прынцыпамі, над ілюзіяй прадвызначанасці, наканаванасці. Кантрасныя вобразы Галілея і Плакса ўвасабляюць варыятыўнасць сэнсаў і адсутнасць абсалютаў, іх спрэчкі не ёсць поўнае адмаўленне дэтэрмінізму, яны толькі пазбаўляюць яго татальнасці. Невыпадкова аптэкар Плакс далучаны да мастацтва (ён кіруе драмгуртком); у гэтым бачыцца жаданне аўтара прымірыць прыродазнаўства і філасофію, прыродную ідэю і разумовую. Характары Плакса і Галілея сведчаць аб прынцыповай складанасці ўсіх ісцін і паняццяў, аб памылковым успрыняцці чалавека толькі як заваяваценя прыроды. Спрэчкі герояў выяўляюць універсалізм філасофскіх разважанняў М. Зарэцкага, гнуткасць яго думкі наконт чалавека і яго месца ў светабудове. Беларускаму пісьменніку бліжэй ідэі плюралізму, дыялога навукі з іншымі формамі пазнання: рэлігіяй, літаратурай, жывапісам, музыкай. Безумоўна, час не спрыяў адкрытай палеміцы беларускага пісьменніка з вульгарызатарскімі падыходамі да праблем тагачаснага грамадства, але і быць безуважным М. Зарэцкі таксама не мог. Такім чынам,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

паэтыка кантрасту давала магчымасць М. Зарэцкаму разглядаць з’явы ўсебакова, паказваць шматмернасць жыцця, актуалізуючы ў першую чаргу гуманістычныя аспекты калектывізацыі. Кантрасныя вобразы выяўлялі ўсю складанасць міжасобасных адносін, непарыўнае дыялектычнае адзінства чалавека і свету, самакаштоўнасць жыцця.

## ЛІТАРАТУРА


Зарэцкі М. Зб. тв.: У 4 т. Мн., 1991. Т. 3.

Лотман Ю.М. Внутри мыслящих миров. М., 1999.

Мележ І. На шырокай плыні жыцця // Літ. і мастацтва. 1969. 21 лістап.

Мушынскі М. Нескароны талент: Праўдзівая гісторыя жыцця і творчасці Міхася Зарэцкага. Мн., 1991.

Павлова Н. Уроки Музиля. Поэтика романа «Человек без свойств» // Вопросы литературы. 2000. № 5. С. 181–207.

Флоренский П.А. У водоразделов мысли // Из истории общественной философской мысли. Избр. произведения: В 2 т. М., 1990. Т. 2. С. 13–438.

Чыгрын І. Проза «Маладняка». Мн., 1985.


Паступіў у рэдакцыю 29.11.09.

*Tarasava T.M.* The Truth of Life and the Truth of the Collectivization: Towards Humanitarian Aspects of the Novel «Viazmo» by Mikhas Zaretski (1932)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ